4/3 N1

ISSN 1993-1972




# ГІСТОРЫЯ
## ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ

Серыя "У дапамогу педагогу"

НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС 4/2009



# ЭТЫКА-ПЕДАГАГІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ АЙЧЫННАГА ТРАКТАТА СЯРЭДНЯВЕЧЧА

## *Матэрыялы да тэмы «Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай і 2-я палова XVI — XVIII ст.»*

***Валерый Болбас,*** *кандыдат педагагічных навук, дацэнт, першы прарэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна*

***Змест школьнай праграмы па гісторыі Беларусі апрача іншага арыентуе і на развіццё маральнай, грамадзянскай, прававой культуры вучняў. Далучэнне да духоўных здабыткаў нашага народа, выхаванне пашаны да гістарычнага мінулага краіны будуць больш эфектыўнымі праз раскрыццё дзейнасці людзей, якія ўзбагачалі культурную спадчыну нашага народа, стваралі трывалы падмурак пачэснага месца Беларусі ў сусветнай супольнасці. Артыкул прысвечаны беларускаму асветніку XVI ст. Міхалону Літвіну — выдатнаму дзеячу айчыннага Рэнесансу. Прапануемы матэрыял мэтазгодна выкарыстоўваць на ўроках па гісторыі Беларусі ў VIII і X класах, а таксама на занятках па грамадазнаўстве.***

Асэнсаванне вызначальнай ролі выхавання і адукацыі ў духоўным і эканамічным развіцці народа, прагназаванне асноўных напрамкаў развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры прымушаюць пільна ўглядацца ў гісторыю, шукаць у мінулым адказы на складаныя пытанні сучаснасці, асабліва на вытокі фарміравання менталітэту як сукупнасці фізічных, псіхічных, інтэлектуальных асаблівасцей і схільнасцей, стэрэатыпаў паводзін людской супольнасці. Аналіз літаратурна-педагагічнай спадчыны айчынных асветнікаў паказвае, што многія з іх спрабавалі вызначыць ролю і месца беларускага этнасу сярод народаў-суседзяў. Цікавасць да падобных твораў назіралася яшчэ ў далёкім мінулым. Развіццё ж у апошні час такіх галін гуманітарных ведаў, як этналогія, этнапсіхалогія і этнапедагогіка, даказвае, што клопат аб развіцці этнічнай самасвядомасці з'яўляецца важнейшым напрамкам педагагічнай думкі, дзейсным сродкам умацавання дзяржавы і асабістага самаўдасканалення. Адным з пачынальнікаў параўнальных даследаванняў традыцый, нораваў, выхавання, рэлігіі, арганізацыі войска і прававых нормаў з'яўляецца беларускі мысліцель XVI ст., пасол крымскага хана Гірэя Міхалон Літвін, аўтар сацыяльна-палітычнага трактата «Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян», вядомага ў скарочаным перакладзе з лацінскай на рускую мову. Да разгляду гэтай працы звярталіся многія навукоўцы [1; 2; 4; 5; 7; 8], але ўсебаковага аналізу яе маральна-выхаваўчага аспекту пакуль што не праводзілася.

Даследчыкі адзначаюць, што твор быў напісаны каля 1550 г., але з-за няўвагі выдаўца ўбачыў свет толькі ў 1615 г. у Базелі (Швейцарыя) на лацінскай мове. Службовае знаходжанне пры двары крымскага хана садзейнічала пашырэнню кругагляду, умацавала імкненне ведамі і набытым вопытам прынесці карысць спакутаванай ад набегаў качэўнікаў Айчыне. Адначасова гэта дазволіла М. Літвіну паказаць татар не толькі як заваёўнікаў, рабаўнікоў, але і аб'ектыўна, знутры: як народ з самабытнай культурай, адметнымі маральнымі, рэлігійнымі, бытавымі традыцыямі, у якога ёсць чаму павучыцца, асабліва ў сферах маральнага і фізічнага выхавання моладзі, спосабаў вядзення вайны.

Прызначэнне трактата «Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян» М. Літвін бачыць у тым, каб веды аб жыцці народаў сталі набыткам караля Рэчы Паспалітай, чыноўнікаў, што, на яго думку, асабліва важна ва ўмовах вайсковых канфліктаў. Ён перакананы, што паспяхова ваяваць можна не толькі сілай зброі і колькасцю войска, але і розумам, ведамі, кемлівасцю і асабліва сілай духу. Важнае месца ў на-

быцці ведаў, у патрыятычным выхаванні і развіцці маральна-валявых якасцей народа асветнік адводзіць кнізе. З дапамогай друкаванага слова ён хоча паказаць суайчыннікам, як пераадолець панічны страх перад татарскімі ордамі і, цвяроза ацаніўшы ўласныя сілы, навучыцца перамагаць.

Аўтар выкарыстоўвае параўнальны аналіз, супастаўленне асобных рысаў характару і маральных якасцей народаў-суседзяў, што надае трактату выразнае грамадзянскае гучанне, узмацняе яго маральна-выхаваўчае ўздзеянне. Асноўны крытычны пафас накіраваны на парадкі ў Рэчы Паспалітай: выкрыццё прычын заняпаду нораваў сярод вышэйшых саслоўяў, забыццё традыцый і празмернае захапленне чужаземным уплывам. М. Літвін не ідэалізуе ні татар, ні жыхароў Маскоўскай дзяржавы, паказвае не толькі станоўчыя, але і адмоўныя якасці іх нацыянальных характараў, што, відаць, і стала адной з прычын малавядомасці твора. Трактат «Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян» у многім блізкі да твораў палітычнай сатыры «Прамова Мялешкі» і «Ліст да Абуховіча», таксама прасякнутых клопатам аб захаванні незалежнасці княства, адраджэнні вайсковай славы продкаў.

Заклапочаны праблемай выжывання свайго народа ва ўмовах жорсткага супрацьстаяння з качэўнікамі, М. Літвін на першае месца ў выхаванні моладзі ставіць фізічнае развіццё, цесна звязанае з пачуццём патрыятызму, духоўным самаўдасканаленнем. Асветнік лічыць, што толькі фізічна і маральна загартаваны чалавек зможа прынесці карысць дзяржаве, і абгрунтоўвае сваю думку, звяртаючыся да вопыту суседзяў. Міхалон Літвін аддае належнае вайсковай вывучцы татар, іх смеласці, самаахвярнасці, здольнасці перш за ўсё думаць пра перамогу, а не пра ўласную бяспеку. Вайсковыя поспехі тлумачыць развіццём пачуцця калектывізму, сістэмай выхавання, накіраванай на фізічную падрыхтоўку дзяцей з ранняга ўзросту. «Эти варвары знают, что нет ничего столь спасительнаго для народов, как храбрость и военная дисциплина, и что мужество состоит в твёрдости, что они презирают изнеженность и удовольствия, ведут жизнь суровую, с детства занимаются верховою ездою, с колыбели возятся на конях и не перестают наездничать уже дряхлыми стариками» [2, с. 19].

Міхалону Літвіну як прадстаўніку шляхты, вайсковага саслоўя ВКЛ, рыцарства блізкая суровая спартанская сістэма выхавання моладзі, што была запатрабавана Сярэднявеччам. «Юноши здоровее бывают в стане военном, нежели дома», — сцвярджае аўтар трактата [2, с. 57]. Можна меркаваць, што на землях Айчыны ва ўмовах пастаянных войнаў адбыўся сінтэз элементаў ваенна-спартыўнай падрыхтоўкі з традыцыямі саслоўнага, рыцарскага і асновамі народнага выхавання. Мужнасць і гераізм, праяўленыя беларусамі ў час змагання з крыжакамі, з качэўнікамі і нават у ходзе апошняй вайны, сведчаць, што абарона роднай зямлі з'яўлялася свяшчэнным абавязкам і важнейшай маральнай каштоўнасцю народа, вызначальнай для эканамічнага і культурнага жыцця, сістэмы выхавання. І калі асновы патрыятычнага выхавання ў народнай педагогіцы зараз даследуюцца шматбакова, то ***традыцыі айчыннага рыцарства*** пакуль недаацэньваюцца, хаця маюць бясспрэчную цікавасць і прыцягальнасць для нашчадкаў. Як вядома, аснову выхавання гэтага саслоўя складалі сем рыцарскіх дабрачыннасцей: валоданне кап'ём, фехтаванне, верхавая язда, плаванне, паляванне, гульня ў шахматы, спевы і гранне на музычных інструментах. Паводле рыцарскага кодэкса гонару, заахвочвалася развіццё такіх якасцей мужчынскага характару, як смеласць, мужнасць, самаахвярнасць, пачуццё асабістай годнасці. Прадугледжваліся выпрабаванні на фізічную, воінскую і маральную сталасць.

Прынята лічыць, што традыцыі рыцарскага выхавання існавалі пераважна ў Заходняй Еўропе. Трактат М. Літвіна, калекцыі рыцарскай зброі і адзення, велічныя сярэдневяковыя замкі ў Міры і Нясвіжы, іншыя фактары пераконваюць, што яны былі распаўсюджаныя, жыццяздольныя і на землях Беларусі. У пачатку XIX ст., паводле сведчання фалькларыста Яна Чачота, неабходнымі для выхавання прадстаўнікоў вышэйшых саслоўяў лічыліся заняткі верхавой яздой, плаваннем, практыкаванні з палашом. Маральны кодэкс шляхты запісаны ў Статуце ВКЛ: «хто бы з битвы утек, таковый... именье и честь

тратить» (раздз. II, арт. 14). Да гэтага можна дадаць характарыстыку літвінскіх воінаў, дадзеную Міхалонам Літвінам: «Прародители наши избегали пищи и питья чужестраннаго. Трезвые и воздержные, они всю славу свою полагали в военном деле, удовольствие в оружие, лошадях, большом числе слуг твердых и отважных и, отражая внешния племена, распространяли свои пределы от одного моря до другаго и назывались врагами "храбрая Литва"» [2, с. 31].

Для Міхалона Літвіна ідэалам кіраўніка дзяржавы, настаўніка і выхавацеля з'яўляецца князь Вітаўт, які неаднаразова згадваецца ў трактаце. Аўтар заклікае захоўваць традыцыі, вучыцца стойкасці на прыкладзе мінулага. Як і для вядомага паэта-лацініста Міколы Гусоўскага, родная прырода і паляванне выступаюць у якасці магутных сродкаў уздзеяння на фізічную і духоўную прыроду чалавека. М. Літвін зазначае, што людзі, якія жывуць на берагах Дняпра, Беразіны, Сожа, Пцічы, Гарыні, Піны і іншых малых і вялікіх рэк, з малых год прывыкаюць плаваць, лавіць рыбу, паляваць. Пастаянныя практыкаванні спрыяюць адточванню і загартоўцы спрыту, сілы, смеласці, стойкасці і самаахвярнасці. З тых, хто прывык да небяспекі, вырастаюць дужыя і смелыя салдаты, здольныя абараніць дзяржаву. Верны вайсковай тэме, М. Літвін падкрэслівае значэнне буйных рэк як важных прыродных аб'ектаў для абароны ад нападаў татар, а таксама ў выхаванні будучых воінаў.

Лаканічна, але ўзнёсла ён апісвае родную прыроду, багацце і неабсяжнасць зямель ВКЛ, расказвае пра традыцыйныя заняткі насельніцтва: бортніцтва, паляванне, развядзенне і адлоў баброў, паведамляе пра асаблівасці веснавога лову рыбы на Прыпяці каля Мазыра. Па яго словах, у лясах шмат зуброў, аленяў, коз, дзікоў. «Птиц удивительно много, так что мальчики весною наполняют лодки яйцами уток, диких гусей, журавлей, лебедей, и потом их выводками наполняются птичьи дворы», — піша М. Літвін, пакінуўшы сведчанне занятку, у якім прымалі ўдзел дзеці: збіранне яек і развядзенне ў няволі дзікіх птушак [2, с. 63].

Захоплены прыгажосцю родных мясцін, асветнік нават месцам знаходжання легендарнай Троі лічыць Кіеўшчыну, якая да заключэння Люблінскай уніі ўваходзіла ў склад ВКЛ. Тут жа, паводле М. Літвіна, жыў у выгнанні Авідзій. Такія гістарычныя паралелі выдаюць эрудыцыю аўтара, яго прыхільнасць да культурнай спадчыны Антычнасці, што ўвогуле характэрна для адукаваных людзей эпохі беларускага Рэнесансу. Неардынарны погляд аўтара і на мову, гісторыю свайго народа — літвінаў, як вядома, такую назву меў беларускі этнас у часы ВКЛ. Іх мову М. Літвін лічыць блізкай да італьянскай, а саміх літвінаў — нашчадкамі ваяўнічых рымлян. Тэорыя гэта была папулярнай сярод мясцовых магнатаў і адукаванай моладзі, хаця і не пацвярджаецца навукоўцамі, але аўтар трактата хутчэй за ўсё свядома выкарыстоўвае гістарычную легенду, каб падняць маральны дух народа, знясіленага вайной. Сваю думку М. Літвін абгрунтоўвае прыкладамі агульных, па яго меркаванні, для рымлян і літвінаў язычніцкіх вераванняў і звычаяў: гаданне па вантробах жывёл і палёце птушак, пакланенне змеям і духам прыроды, якія насяляюць гаі, рэкі, азёры, вера ў ачышчальную сілу агню і г.д. Аўтар знаходзіць падабенства ў лексічным складзе літвінскай і італьянскай моў. У мове ён бачыць сродак патрыятычнага выхавання, «пабуджэння да доблесці». М. Літвін заклапочаны недастатковым развіццём школьнай справы ў краі, адсутнасцю гімназій. Зазначае, што вывучэнне толькі рускай мовы не можа поўнасцю задаволіць патрэбы мясцовага насельніцтва.

Можна меркаваць, што аўтар свядома абраў для напісання твора лацінскую мову. Яе веданне ўвогуле з'яўлялася прыкметай адукаванасці ў эпоху Адраджэння, абавязковай умовай навучання ва універсітэтах. Так што ***рэнесанс у вывучэнні замежных моў, які назіраецца ў Беларусі, можна лічыць гістарычна апраўданым***. Трэба спадзявацца, што веданне англійскай мовы, як некалі латыні, дасць новы штуршок для развіцця навукі, успрыняцця лепшых здабыткаў агульначалавечай маралі і культуры ў шырокім сэнсе. Іншая справа, што гэта ўвогуле станоўчая тэндэнцыя і ў мінулым і сёння мае для беларусаў адваротны бок: у выніку засваення іншых моў адбываецца адрачэнне інтэлігенцыі не толькі ад роднай

мовы, але і ад выхаваўчых традыцый, нацыянальнага спосабу жыцця і светаўспрыняцця, бо гэтыя з'явы ўзаемазвязаны.

Асветнік лічыць, што ўмацаванню дзяржаў садзейнічаюць смеласць, устрыманне, здольнасць да актыўнай дзейнасці. Гэтыя якасці ён адзначае ў характары суседзяў, але знаходзіць недастаткова выражанымі ў прадстаўнікоў свайго народа і перакананы, што іх трэба развіваць. Як відавочца і непасрэдны ўдзельнік вайсковых паходаў, М. Літвін параўноўвае фізічныя і маральныя якасці воінаў, дае ім сваю адзнаку. Ён зазначае, што масквіцяне перанялі ў татар спосабы вядзення вайны, а калі патрабуюць абставіны, то не саступаюць ім у хітрасці, вераломстве, непастаянстве прыняцця рашэнняў. Літвіны ж бяруць верх у бітвах твар да твару, строем, але прастадушна трапляюць у расстаўленыя пасткі, лёгка паддаюцца хлусні і падману. Аўтар трактата бачыць у гэтым прычыну паражэнняў, напрыклад, у бітве пад Ачакавам, а таксама дзяржаўных пралікаў і асабістых няшчасцяў. Міхалон Літвін неаднаразова звяртае ўвагу на неабгрунтаваную даверлівасць, прастадушша жыхароў княства, якія ўмела выкарыстоўваюцца суседзямі. Нават на рынку нявольнікаў у Кафе «аукционер кричит громко, что это рабы самые новые, простые, не хитрые, только что привезённые из народа Королевскаго, а не Московскаго» [2, с. 23]. Асветніку і дыпламату балюча, што станоўчыя ў цэлым рысы характару прыносяць шмат пакут мужнаму, працавітаму, але празмерна даверліваму народу. Гэтыя развагі актуальныя і для сённяшніх распрацоўшчыкаў тэорыі выхавання. Невыпадкова сучасныя расійскія даследчыкі адзначаюць, што, ***калі асобныя рысы нацыянальнага характару нельга пераадолець як асаблівасць менталітэту***, неабходна карэкціраваць іх праяўленне з дапамогай ***выхавання***, добрага ведання паводзін і псіхалогіі чалавека.

М. Літвін выступае як прыхільнік традыцыйнага, нават аскетычнага ладу жыцця. Гэта, па яго перакананні, неабходна дзеля выратавання народа. У вусны палоннага суайчынніка, закаванага ў кайданы, аўтар укладае словы любві і ўдзячнасці Бацькаўшчыне, а таксама думку аб тым, што ўсё насельніцтва Вялікага княства Літоўскага загіне, «если только вы упорно будете держаться тех же пагубных нравов, ведущих вас прямо к гибели» [2, с. 25]. Трактат «Аб норавах літоўцаў, татар і масквіцян» — адзін з нямногіх дайшоўшых да нас твораў айчыннага пісьменства, дзе відавочца расказвае пра жахі татарскай навалы: здзекі з людзей, якім зажыва вымалі вантробы, каб выкарыстаць іх для гадання, а жоўць — для мазі і г. д. Пэўны натуралізм патрэбны аўтару, каб садзейнічаць абуджэнню патрыятызму, святой нянавісці да ворагаў, а таксама паказаць адмоўныя якасці характару татар: схільнасць да жорсткасці, фізічных здзекаў з палонных. М. Літвін зазначае, што «их особенное войско, янычары, с детства обучающиеся военному искусству и военной дисциплине, из коих избираются вожди и бароны, все происходят от нашей крови» [2, с. 23]. Як бачна з гэтага прыкладу, педагагічныя сістэмы Усходу напрацавалі мноства прыёмаў уздзеяння праз сістэму фізічнага выхавання на маральна-валявыя якасці асобы, што яшчэ патрабуе пераасэнсавання славянскімі народамі не толькі як факта гісторыі, але і з мэтай прадухілення сучаснага манкуртызму, пераадолення афганскага сіндрому. Беларускі асветнік-гуманіст папярэджваў, што аддаленасць ад роднай зямлі, сваёй сям'і і традыцый, мовы і рэлігіі, падмацаваная прадуманым фізічным уздзеяннем, можа прывесці да пераарыентацыі ў сістэме маральных каштоўнасцей і з'яўляецца цяжкім выпрабаваннем, асабліва для моладзі.

Міхалон Літвін зазначае, што еўрапейцы лічаць татар варварамі, але высокія маральныя якасці большасці простых людзей, безумоўна, заслугоўваюць павагі. Па назіраннях пасла ВКЛ, татары — гэта цвярозы, стрыманы, умераны, гасцінны і ветлівы народ. Жыццё качэўнікаў, першабытнае, пастухоўскае, уяўляецца М. Літвіну своеасаблівым «залатым векам», які грунтуецца на патрыярхальных звычаях, калектывізме, адсутнасці прыватнай уласнасці і рэзкай мяжы паміж беднымі і багатымі. Паводле язычніцкіх, а не толькі рэлігійных, традыцый, татары дапамагаюць бедным, але строга сочаць за захаваннем справядлівасці, не патураюць жабракам.

У сістэме выхавання моладзі М. Літвін адзначае добрую фізічную загартоўку,

якая дазваляе цярпліва пераносіць холад, голад, смагу і бяссонніцу, павагу да старэйшых, звычай сумесна харчавацца, насіць аднолькавыя адзенне і прычоску. Гэта, на думку педагога, садзейнічае выхаванню калектывізму, імкненню да агульнага дабрабыту, спрыяе таму, што сярод татар мала злодзеяў, ніхто не галадае. «Так и у варваров этих никто, живущий в довольстве, не задушается обжорством, ни один бедный не умирает с голоду или холоду; никто у них не нищенствует при такой их бедности и недостатке. Как редко встретишь у них мота, также редко найдёшь умирающаго с голода, нищенствующаго, обманщика, стяжателя чужаго, сутягу, несправедливаго судью, лживаго свидетеля, клятвопреступника, вора, разбойника», — сцвярджае асветнік [2, с. 15]. Аўтар падкрэслівае, што татары не п'юць віна, у ежу ўжываюць гарчыцу, часнок, цыбулю, малако і калодзежную ваду, жывуць у цесным адзінстве з прыродай. М. Літвін невыпадкова канцэнтруе ўвагу на вобразе жыцця і быце качэўнікаў, іх уздзеянні на маральнае фарміраванне асобы. Ён слушна лічыць, што калектывізм, прытрымліванне нормаў звычаёвага права, традыцый народнай педагогікі былі ўласцівы і нашым продкам, якія вызначаліся непатрабавальнасцю да ежы, адзення, гарманічным маральна-фізічным развіццём, пастаяннай гатоўнасцю абараняць Айчыну. Забыццё традыцый, ***сляпое капіраванне чужаземных звычаяў***, асабліва прадстаўнікамі вышэйшых саслоўяў, аўтар адносіць да асноўных прычын маральнай і фізічнай разбэшчанасці, заняпаду нораваў у княстве. М. Літвін піша, што колькасцю адзення і ўпрыгожанняў літвінская знаць пераўзыходзіць не толькі татар, але і масквіцян, якія праяўляюць значна больш практычнасці і пачуцця меры. Асветнік рэкамендуе ва ўсім абапірацца на ўласныя сілы. Напрыклад, не купляць дрэнных коней у татар, а разводзіць сваіх, не набываць у масквіцян сабаліныя шапкі за золата, а больш дбаць пра ўмацаванне дзяржавы, развіваць рамёствы па прыкладзе суседзяў. Як адзначаюць даследчыкі, М. Літвін прытрымліваецца ўмерана стаічнай канцэпцыі маралі, лічыць неабходным праяўляць самаабмежаванне, асабістую сціпласць і разумную эканомію на дзяржаўным узроўні.

Асветнік выступае супраць празмернага захаплення замежнай ежай, вострымі прыправамі і вінамі, звяртае ўвагу на тое, што стравы, якім аддавалі перавагу дзяды і прадзеды, з'яўляюцца гарантам фізічнага і маральна-псіхалагічнага здароўя народа, прыкметай яго этнакультурнага адзінства і часткай выхаваўчых традыцый. Ён асабліва нецярпімы да такога сацыяльнага зла, як п'янства, што ўяўляе сур'ёзную небяспеку для здароўя, жыцця, маральнасці асобы і ўсяго народа. М. Літвін паведамляе, што ў татар п'яніца пазбаўляецца грамадзянскіх правоў, не можа звяртацца ў суд, 80 udaraў палкамі атрымлівае той, хто толькі пакаштуе віна. Не менш жорстка караецца гэта зло і ў Маскоўскай дзяржаве, дзе за распаўсюджванне спіртнога нясуць адказнасць нават суседзі вінаватага. «В городах Литовских нет более частых заводов как те, на которых варится из жита водка и пиво», — адзначае аўтар трактата [2, с. 31]. Ад п'яных спрэчак і свар, па яго словах, гіне больш людзей, чым на вайне. Нярэдка сяляне ідуць у шынкі і прапіваюць маёмасць, а затым становяцца рабаўнікамі і, уступаючы ў канфлікт з законам, падвяргаюцца пакаранням. Прыкметай шырокага бытавання п'янства з'яўляецца тое, што п'юць і юнакі, і жанчыны, і дзеці, а мужчыны нават у вайсковы паход не выпраўляюцца без гэтага зелля. Мысліцель заклікае суайчыннікаў па прыкладзе татар весці цвярозае жыццё, апелюе да самасвядомасці і прынцыпаў самаўдасканалення, імкнецца абудзіць механізмы самазахавання народа, для якога алкаголь уяўляе сур'ёзную пагрозу.

Адметны погляд М. Літвіна на сям'ю, дзе пераважае практычны падыход. З пазіцый вайскоўца, заклапочанага наяўнасцю маладых і дужых салдат, ён станоўча ацэньвае мнагажонства ў татар, у шматлікіх сваяцкіх сувязях бачыць ***сродак для ўмацавання сям'і і дзяржавы***. Дыпламат адзначае, што татары выбіраюць жонак не за знешнюю прыгажосць, багацце і знатнасць роду, а найперш за іх маральныя якасці. Асветнік падкрэслівае, што жанчын бяруць у дом не для ўцехі, а для нараджэння і выхавання дзяцей. Апавядаючы пра асаблівасці жыцця суседняга народа, ён спрабуе вызначыць прычыну нетрываласці сямейных сувязей сярод су-

айчыннікаў. Аўтар трактата звязвае пагаршэнне маральнасці са зменай эканамічных асноў будаўніцтва сям'і. Нагадвае, што ў старажытнасці славяне плацілі за жанчын выкуп — крэна, цяпер жа мужчыны імкнуцца атрымаць у пасаг зямлю і багацце, надаюць вялікую ўвагу знешнасці абранніц і праз гэта губляюць уладу ў сям'і. М. Літвін адзначае самавольства добра забяспечаных жанчын, амаральныя паводзіны, гультайства, пашырэнне звычаю насіць мужчынскае адзенне. Для ўмацавання сям'і, павышэння аўтарытэту мужчыны ён прапануе аддаваць замуж дзяўчат не па асабістай згодзе, а па волі старэйшых, прычым выбіраць жаніхоў не радавітых і багатых, а найперш доблесных воінаў. Такі падыход быў характэрны для большасці народаў на ранніх этапах гістарычнага развіцця. Меркаванне айчыннага асветніка канстатуе той факт, што, нягледзячы на змены ў грамадстве, ацэнка асноўных маральных якасцей мужчыны засталася са старажытнасці практычна нязменнай у народным светаўспрыманні, што зафіксавана ў літаратуры і фальклоры.

У пытаннях веры, рэлігійнага выхавання М. Літвін таксама блізкі да поглядаў беларускага народа, які заўсёды меў веру, ***бога ў душы***, але крытычна ставіўся да служыцеляў культу розных канфесій. Аўтар свядома аддае перавагу каталіцкай, рымскай веры як паказчыку высакароднага паходжання шляхты, а таксама для захавання адметнасці літвінаў ад жыхароў Маскоўскай дзяржавы. Метад супастаўлення рэлігій розных народаў дае магчымасць востра крытыкаваць празмерна раскошнае ўбранства храмаў, прагу духавенства да пачуццёвых асалод, да займання высокіх пасад у маладым узросце, калі яшчэ не сфарміраваны светапогляд і маральныя прынцыпы, не спазнаны асноўныя ўласцівасці характару. «Как трутни съедают мёд пчелы, так они поедают труды народа», — такую ацэнку дае асветнік-гуманіст каталіцкаму духавенству [2, с. 77]. Але ён не адмаўляе рэлігію і на прыкладзе татар паказвае, што пры правільным падыходзе яна становіцца ўплывае на звычаі, выхаванне, маральна-этычныя паводзіны. «Так, пры выкананні абрадаў татары не спадзяюцца на свяшчэннаслужыцеляў, смяюцца з нашых пастоў без разваг аб боскім, без малітвы», — адзначае М. Літвін, каб накіраваць суайчыннікаў на шлях свядомай веры, якая праходзіць праз розум і пачуцці, з'яўляецца важным сродкам самаўдасканалення і нават перавыхавання індывіда.

Асноўным прынцыпам грамадскага ўладкавання і моцы дзяржавы аўтар лічыць справядлівасць і адпаведныя адносіны паміж людзьмі, таму павучальна дакарае сваіх супляменнікаў: «Татары превосходят нас не только воздержанием и благоразумием, но и любовию к ближнему. Они сохраняют между собою взаимное расположение и оказывают друг другу добро; справедливо обращаются и с рабами, хотя имеют их только из чужих стран. Несмотря на то, что этих рабов приобретают они войною или куплею, они не держат их в рабстве далее как до семи лет. А мы держим в беспрерывном рабстве людей своих, добытых не войною и не куплею, принадлежащих не к чужому, но к нашему племени и вере» [2, с. 47]. Асветнік рашуча выступае супраць эканамічнага і духоўнага прыгнёту, непамерна высокіх падаткаў, саслоўнага суда, што садзейнічаюць ператварэнню простага чалавека ў раба. Неабходным для ўстанаў*лення справядлівасці, законаў маралі* ў грамадстве М. Літвін лічыць дасканалую сістэму правасуддзя. На яго думку, ***законнасць***, якая ***павінна садзейнічаць паляпшэнню нораваў***, пазбаўленню ад такіх заган, як п'янства, крадзёж, абясцэньванне чалавечага жыцця, занядбана ў родным краі. Аўтар ставіць пад сумненне правільнасць дзейнасці судоў, дзе за большасць паслуг бярэцца ўзнагарода, забойства ж чалавека караецца толькі штрафам, а не смерцю. У трактаце адзначаецца, што не ўсе людзі роўныя перад законам і «бедняк, желая позвать к суду магната, ни за какия деньги не найдёт себе стряпчаго» [2, с. 39]. М. Літвін звяртае ўвагу на тое, што разгляд спраў у судзе нярэдка залежыць не ад ступені віны, а ад асабістых адносін з чыноўнікамі, маральных якасцей суддзяў, якіх службовае становішча падштурхоўвае да п'янства, хабарніцтва. Асветнік заклапочаны недахопамі ў рабоце судоў і прапануе пільна прыглядацца да вопыту суседзяў, ашчадна ставіцца да спадчыны мінулага, нават язычніцкіх законаў, каб устанавіць справядлівасць паводле нацыя-

нальных падыходаў і прынцыпаў агульначалавечай маралі.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, можна адзначыць, што трактат Міхалона Літвіна «Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян» — твор глыбока патрыятычны, хаця ў ім крытычны пачатак пераважае над станоўчым падыходам. Як строгі і патрабавальны настаўнік, аўтар дае даволі нізкую адзнаку маральнасці тагачаснага грамадства, асабліва шляхты, духавенства, судовых чыноўнікаў. Асуджае імкненне да раскошы, п'янства, аслабленне сямейных сувязей, адыход ад прынцыпаў калектывізму, што складаюць фундамент народнай маралі і выхавання. Але крытычны падыход, параўнанне з больш значнымі дасягненнямі суседзяў у розных сферах сацыяльна-маральнай рэчаіснасці з'яўляюцца для М. Літвіна не самамэтай, а метадам уздзеяння на суайчыннікаў, што, па яго перакананні, спрыяе абуджэнню этнічнай, асабістай і дзяржаўнай самасвядомасці. У гэтым асветнік бачыць выкананне свайго грамадзянскага абавязку, праяўленне клопату аб агульным дабрабыце і справе выхавання.

*Як навучыць вучняў бачыць сувязь паміж маральнымі якасцямі асобы і яе грамадзянскай пазіцыяй, паміж асабістым духоўным развіццём і дабрабытам дзяржавы? З мэтай вырашэння гэтага пытання мэтазгодна прапанаваны матэрыял замацаваць шляхам пастаноўкі перад вучнямі наступных пытанняў:*

1. Якія якасці асобы з'яўляюцца вызначальнымі для сапраўднага грамадзяніна?

2. Што ўяўлялі сабой дабрачыннасці айчыннага рыцарства?

3. Чым вызначаецца, на думку М. Літвіна, месца беларусаў сярод іншых народаў?

4. Якую ролю адыгрывае сям'я ў развіцці краіны?

*Абмеркаванне адказаў на гэтыя пытанні ў рэчышчы вывучэння беларускага Рэнесансу дазволіць акцэнтаваць увагу на маральна-грамадзянскіх каштоўнасцях чалавека, зрабіць актуальным для самаразвіцця асобы навучэнцаў зварот да гістарычнага мінулага свайго народа на пазіцыях патрыятызму і грамадзянскасці.*

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Любавский, М. К.* Кто был Михайло Литвин, написавший в половине XVI в. трактат «О нравах татар, литовцев и москвитян» / М. К. Любавский // Учёные записки Института истории. — 1929. — Т. 4. — С. 49–54.
2. Десять отрывков разнообразнаго историческаго содержания (из сочинения) Михалона Литвина «О нравах татар, литовцев и москвитянъ» // Архив историко-юридических сведений, относящихся до России, издаваемый Н. Калачовым. — М., 1854. — Кн. 2. — Отд. 3. — С. 1–78.
3. *Дзербіна, Г. В.* Літвін Міхаіл / Г. В. Дзербіна // Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыклапедычны даведнік. — Мінск, 1995. — С. 96–97.
4. *Сокол, С. Ф.* Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI — первой половины XVII в. / С. Ф. Сокол. — Минск, 1984. — С. 50–106.
5. *Падокшын, С. А.* Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі / С. А. Падокшын. — Мінск, 1990. — С. 135–198.
6. *Лакотка, А.* Стала ім роднай зямля беларуская / А. Лакотка // Спадчына. — 1991. — № 3. — С. 64–73.
7. *Семянчук, А.* Міхалон Літвін / А. Семянчук // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск : БелЭн, 1999. — С. 214.
8. *Охманьский, Е.* Михалон Литвин и его трактат о нравах татар, литовцев и москвитян середины XVI в. / Е. Охманьский // Россия, Польша и Причерноморье в XV–XVIII вв. — М., 1979.